# Ведамасці

Гарадская газета Гродна № 4 19 лістапада 2007

ЗА СВАБОДУ!

Шок

*Маргарыта Царан будзе вымушаная плаціць за навучанне ва універсітэце, які падставіў яе пад крымінальны артыкул.*

***“…Грибы. Мухомор высушить, измельчить – под язык…***

***… Экстази даёт большую порцию физической и психической энергии, чувство радости… употреблять можно через нос, в виде раствора “по вене” – сильнее…***

***…Коноплю можно высушить и выкурить. Нет никакой зависимости…***

***…Наркоманы – философы…”***

# Падставілі

Гэта - урыўкі з канспектаў студэнтаў псіхалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы (ГрДУ). Такім быў змест лекцый па “Асновах права” выкладчыка Андрэя Здасюка. Акрамя адкрытай прапаганды наркотыкаў, Здасюк займаўся іх продажам. Адной з яго ахвяраў стала студэнтка-першакурсніца псіхалагічнага факультэта Маргарыта Царан, якая за куплю 0,28 грам марыхуаны атрымала 4 гады зняволення. Выкладчыку-драгдылеру следчыя дазволілі збегчы ад пакарання.



Фота: «Ведамасці»

**Маргарыта Царан у турэмнай робе**



**Канспект студэнтаў псіхфака**

Нагадаем, у сакавіку студэнтку Маргарыту Царан асудзілі за набыццё марыхуаны. Наркотык яна купіла па просьбе знаёмага, Андрэя Кіселя, у свайго выкладчыка Здасюка. Калі прынесла Кіселю, яе ўжо чакалі міліцыянты. Дзеўчына правяла агулам 5 месяцаў ў калоніі, да верасня, пакуль прэзыдыюм Гарадзенскага абласнога суда не змяніў прысуд на больш мяккі – 3 гады ўмоўна.

### На жыўца

Андрэй Кісель быў завербаваны міліцыяй. Злапаны за ўжыванне марыхуаны, хлопец меў “’заданне” - знайсці чалавека, які змог бы купіць наркотык у выкладчыка Здасюка. Маргарыта стала такой “нажыўкай”. У якасці “ўзнагароды за супрацоўніцтва” Кіселю пазней далі ўмоўны тэрмін.

На першым і адзіным допыце адразу пасля затрымання выкладчык Андрэй Здасюк прызнаўся ў продажы марыхуаны і Маргарыце і іншым маладым людзям, нават школьнікам. Але следчы прыняў рашэнне адпусціць выкладчыка пад падпіску аб нявыездзе.

Маці Маргарыты, Валянціна Царан, якая выступала абаронцай дачкі ў гэтай справе, мяркуе, што следчы так зрабіў, бо драгдылер насамрэч супрацоўнічаў са спецслужбамі: ***“Звычайнага чалавека не адпусцілі б! Ён прызнаўся ў факце неаднаразовага продажу наркотыкаў нават дзецям - Здасюку пагражала да 10 гадоў зняволення”***, - лічыць Валянціна Царан.

У пракуратуры “Ведамасцям” патлумачылі дзеянні следчага так: ***“Проста няма сэнсу арыштоўваць і карміць за дзяржаўны кошт розных “наркаманаў” на час следства”.***

### Альма-мачыха

Ад моманту інцыдэнта Універсітэт не зрабіў нічога, каб гісторыя Маргарыты Царан не паўтарылася з іншымі студэнтамі.

Калі распачалася крымінальная справа супраць Маргарыты, афіцыйна ГрДУ не толькі не паспрабаваў абараніць сваю студэнтку – адміністрацыя паспяшалася ціха пазбавіцца дзеўчыны.

***“Яны пачалі вінаваціць толькі мяне. Маўляў: “Вы дарослы чалавек і павінны былі думаць галавой, што робіце”***, - узгадвае Маргарыта.

***“У дэканаце трэсліся за свае месцы. Выкладчык знік, а дачку папрасілі напісаць заяву па асабістым жаданні, каб толькі ўсё было ціха і мірна: няма ні студэнта ні выкладчыка”***, - распавядае Валянціна Царан.

Маці доўгі час спрабавала дамагчыся сустрэчы з рэктарам: ***“Мяне не пускалі нават у прыёмную. Пытаю: “Чаму?” Адказваюць: “Бо тут ёсць слова “наркотыкі”.***

Выкладчык, афіцыйная асоба, распаўсюджваў наркотыкі адкрыта, дыктуючы прайс падчас лекцый, ледзь не ад імя універсітэта - але ў ГрДУ гэты факт не стаў нагодай хоць бы для простага “абмеркавання ў калектыве”. Ніхто з арганізатараў вучэбнага і выхаваўчага працэсу не быў пакараны нават вымовай. Тым больш ніякіх наступстваў не было і для кіраўніцтва адукацыйнай і ідэалагічнай “вертыкаляў” горада і вобласці.

Дэкан юрфака Марыя Жук, дзе працаваў выкладчык, баіцца размаўляць на тэму Здасюка: ***“Мне не зразумела як выкладчык мог дапусціць такое, тым больш выкладчык права…”*** Спадарыня Жук узгадала, што перш чым стаць аспірантам і выкладчыкам, Здасюк “быў адным з найлепшых студэнтаў”.

Супрацоўніца кафедры “Дзяржаўнага працоўнага і сельскагаспадарчага права” юрыдычнага факультэту цвёрда запэўнівае “Ведамасці”: ***”Здасюк быў добрым выкладчыкам, бо ў нас дрэнных няма”.***

Вартаадзначыць, што рэктар ГрДУ Яўген Роўба аказаўся адзіным чалавекам з адміністрацыі Універсітэта, хто, хоць і прыватна, але папрасіў прабачэння ў Маргарыты Царан. “За ўсіх” – але ўжо пасля таго, як дзеўчына выйшла з 5-месячнага заключэння.

### Пасля калоніі

***“За тое, што я мылася часцей, чым адзін раз на тыдзень, мяне пастаянна каралі пазачарговай прыборкай туалетаў”***, - узгадвае дзеўчына эпізоды са свайго жыцця ў калоніі. У яе рэзка пахіснулася здароўе.

Цяпер Маргарыта рыхтуецца зноў аднаўляцца на вучобу ва універсітэце. Але ўсе хадайніцтвы пра бюджэтную форму навучання адміністрацыя ГрДУ адхіліла. Дзеўчыне прапанавалі аднавіцца на платнае аддзяленне.

**Іван Ткачук**

Смех

# Па-“новабеларуску”

**Даваць дзецям імёны, у якіх адбіваецца ідэалагічная сутнасць новай ўлады, яе эканамічныя, сацыяльныя, ды культурныя прыярытэты – пра гэтую старую рэвалюцыйную традыцыю нагадаў рэдакцыі “Ведамасцяў” нашў чытач Аляксандр.**

У сваім мэйле, дасланым, дарэчы, на наступны дзень пасля адзначэння 90-й гадавіны падзеяў лістапада 1917 года Аляксандр піша:

***“На мой вялікі жаль даводзіцца прызнаць, што ў маладой Беларускай дзяржаве гэтая традыцыя апынулася незаслужана занядбанай! Але ж нашым грамадзянам ёсць што ўшанаваць новымі беларускімі, ці лепш “новабеларускімі” імёнамі!”***

Аляксандр даслаў і свае першыя варыянты імён! Яны настолькі прыйшліся даспадобы




ў рэдакцыі, што цяпер мы звяртаецца да ўсіх чытачоў: далучайцеся! Асноваў для “новабеларускага” імя можа стаць любая фраза, лозунг, загаловак, устойлівы выраз – галоўнае, каб ён адлюстроўваў эпоху, у якой мы жывем. Самыя цікавыя варыянты будзем друкаваць у наступных нумарах – а раптам хто скарыстаецца!

**“Новабеларускія імёны”**

**Для хлопчыка:**

**Язал** – “Я за Лукашенку”
**Задубел** - “За духовную Беларусь”
**Засильпроб** – “За сильную и процветающую Беларусь”
**Грогорам** - “Гродна – горад-музей”
**Бобегор** - “Бобруйск – был еврейский город”
**Завламил** - “За Александра Владимировича Милинкевича”
**Наполдосос** – “Наша политика добрососедства”
**Бабостол** - “Беларусь – в авангарде борьбы с торговлей людьми”
**Сагдед** – “Саша, где деньги?”

**Для дзяўчынкі:**

**Бесдна** - “Беларусь – страна для народа”
**Язаба** – “Я за бацьку”
**Примпоза** – “Программа импортозамещения”
**Выбольна** - “Выбраны большасцю народа”
**Задубена** – “За духовность беларуского народа”
**Слаба** – “Славянский базар”
**Либида** - “Лицо Беларуси – Ирина Дорофеева”

Цэнзуру рэдактара “Ведамасцяў” не прайшлі варыянты: “Съезд белорусских учёных”(універсальнае імя), “За единение Беларуси и России” (мужчынскае імя).

# Замест штампа

**Штамп «На ўсе краіны свету»плануецца адмяніць. Але практычна бескантрольна заносіць грамадзянаў у «спісы невыязных» зможа любая ўстанова - ад пракуратуры да ЖЭСа.**


Фота: «Ведамасці»

Вашае імя ў "базе дадзеных" спраўдзіць памежнік

Адмяніць ад новага года штамп «Ва ўсе краіны свету» і замест яго стварыць электронны «агульны банк дадзеных" асобаў, якім абмежаваны выезд з Беларусі – праект такога ўказа падрыхтавала Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

Як паведамілі "Ведамасцям" у дэпартаменце па грамадзянству і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў, выезд будзе ажыццяўляцца па агульнанацыянальных пашпартах, ніякіх замежных пашпартоў праект указа не прадугледжвае.

"Банк дадзеных" пакуль знаходзіцца ў папяровай форме, супрацоўнікі памежных службаў правяраюць выязжаючых па тоўстых спісах. Новая база будзе ў электроннай сетцы, даступнай усім зацікаўленым службам. Цяпер заканчваецца мантаж абсталявання сеткі – кампутараў, электронных прыладаў пашпартнай праверкі - на ўсіх памежных пераходах Беларусі.

Забарону на выезд грамадзянаў з тэрыторыі Беларусі рэгулюе Закон «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзянаў Рэспублікі Беларусь». Згодна арт 5, у "спіс невыязных" могуць быць уключаныя тыя, хто мае доступ па характару службы да сакрэтнай інфармацыі, знаходзіцца пад следствам, мае нясплачаныя пазыкі.

Па інфармацыі Міністэрства, праект указа не прадугледжвае магчымасці для грамадзяніна атрымаць інфармацыю, ці ёсць яго імя ў гэтым «банку дадзеных», а таксама якая служба мае да яго прэтэнзіі. ***"Кожны павінен сам ведаць свае грахі",*** - пракаментаваў іншы чыноўнік Міністэрства.

Тым больш не даецца магчымасці аспрэчыць абмежаванне на выезд. ***"Законнасць уключэння грамадзяніна ў спіс невыязных на сумленні тых органаў, якія ўключаюць грамадзяніна ў гэты спіс"*** – заявілі ў Міністэрстве.

Такім чынам, кола службаў, якія могуць забараніць грамадзяніну выязджаць з краіны, з'яўляецца вельмі шырокім – гэта і сілавыя службы, і судовыя выканаўцы, навуковыя арганізацыі, прадпрыемствы, і нават аўтобусныя дэпо, калі пасажыр адмовіцца плаціць штраф за безбілетны праезд.

Праект гэтага ўказа праходзіць стадыю ўзгаднення ў дзяржустановах.

Адначасова на сённяшні момант больш за 40 тысячаў грамадзянаў Беларусі маюць абмежаванні на выезд з краіны (з улікам колькасці асуджаных).

**"Ведамасці"**

# "Шэнген"набліжаецца

**Польскія візы, выдадзеныя на першыя месяцы 2008 года, не будуць ануляваныя, нягледзячы на тое, што Польшча ўжо ўвойдзе ў Шэнгенскую зону.**

Ад 1 студзеня непасрэдныя краіны-суседкі Гродзеншчыны, Польшча і Літва, далучаюцца да Шэнгенскага пагаднення. Як паведамілі "Ведамасцям" ў Генеральным консульстве Рэспублікі Польшча ў Гродне, шматразовыя нацыянальныя польскія візы, тэрмін якіх ахоплівае першыя месяцы 2008 года – ад новага года не анулююць, па іх можна будзе наведваць суседнюю краіну, але толькі да 1 сакавіка. Але калі такая віза скончыцца, ізноў уехаць у Польшчу можна будзе толькі па шэнгенскай візе.

Кошт аднаразовай шэнгенскай візы ў Польшчу ці Літву будзе 60 еўра - гэта стандартны цэнавы ўзровень. Праўда, Беларусь можа заключыць з Еўрасаюзам асобную дамову і дамагчыся зьмяншэння візавых коштаў. Напрыклад, расійскія ды ўкраінскія дыпламатычныя службы "выбілі" для сваіх грамадзянаў кошт у 35 Еўра.

Але гэта – на ўзаемных умовах, а значыць, што для грамадзянаў усіх краінаў Шэнегенскай дамовы кошт беларускіх візаў павінен быць зніжаны да такога самага ўзроўню. (Для параўнання: беларуская шматразовая віза на 90 дзён для грамадзяніна Польшчы каштуе, як і для беларуса польская – 30 еўра. А вось для грамадзяніна Германіі яна каштуе ўжо 300 еўра).

Беларускія дыпламаты тэарэтычна маюць шанс дамовіцца і пра бясплатныя візы для жыхароў памежжа: Шэнгенскае пагадненне прадугледжвае такую магчымасць для тых, хто жыве ў 25-кіламетровай і нават 50-кіламетровай зоне па двух баках удоўж граніцы. Але ініцыятыву павінен выказаць беларускі бок. ***"Для Польшчы гэта не вельмі істотна, таму што па польскім баку ў 50-кіламетровай зоне няма такога вялікага горада. А па беларускім – ёсць Гродна і Брэст. Калі беларускі бок будзе больш актыўны, гэтае пытанне можна вырашыць",*** - пракаментаваў былы Генеральны консул Генеральнага консульства Польшчы ў Гродне Анджэй Крэнтоўскі. Пакуль перамовы беларускага МЗС і Еўрасаюза трываюць.

Адначасова з Польшчай і Літвой у Шэнгенскае пагадненне ўступаюць Чэхія, Славакія, Славенія, Венгрыя, Мальта, Эстонія, Латвія. Ужо з 21 снежня 2007 года будзе спынены памежны кантроль на ўнутраных і водных граніцах між усімі гэтымі краінамі. А кантроль на паветраных граніцах спыняць у сакавіку 2008 года.

**Аляксей Ведзіч**

**Ёсць справа**

*Собираем подписи за решение проблемы автостоянок в микрорайоне «Вишневец».*

# Дворы – не для транспорта

**В микрорайоне «Вишневец» дворовые территории и близлежащие дороги заставлены автомобилями. Дошло до того, что ни скорая помощь ни пожарные часто не могут проехать через дворы микрорайна, чтобы оказать жителям необходимую помощь.**




Я неоднократно подымал вопрос о проблеме автопарковок. Однако городские чиновники отговаривались тем, что в центре микрорайона имеется стоянка УКСа Гродненского горисполкома, да еще недалеко от нее еще две стоянки. Но ведь в микрорайоне «Вишневец» живёт больше 20000 человек, они являются владельцами примерно 10000 автомобилей – а существующие стоянки вмещают не более 1000 машин.

Стоянка УКСа посреди микрорайона – это одно из худших решений, так как находится она в густонаселенном месте, где более уместен торгово-бытовой объект (салоны, магазины, мастерские бытовых услуг, ресторан, кинозал), которого как раз в Вишневце и нет. Жители ближайших домов собирали подписи против строительства этой стоянки, но местные власти их заверяли, что «объект временный». Временное однако стало постоянным.

Случайно ли, но после того, как появилась инициатива создания Территориального комитета самоуправления в микрорайоне «Вишневец», власти города пошли на примитивные меры решения этой проблемы. А именно - чтобы увеличить места для парковок, начали урезать детские площадки и зеленую зону.

Я предлагаю решение ситуации со стоянками для автотранспорта ***(см. схему)***

Я начинаю сбор подписей застроительство новых стоянок и предлагаю жителям микрорайона присоединиться к этой акции. Подписи мы передадим городским властям – они будут обязаны рассмотреть и ответить нам по-существу.

Решение проблемы автостоянок может стать нашим первым реальным делом.

Чтобы поставить подпись или получить подписные листы – связывайтесь со мной по тел. ***54-92-31, (+375) 29 786 32 71***

**Сергей Кузьменок**
**Депутат Гродненского городского Совета депутатов2003-2007г.г.**

- **Построить новую автостоянку на пустыре в районе Индурского шоссе – Кабяка, неподалеку гаражного массива. Возможно строительство стоянки для 500 автомобилей. (На схеме -1)**
- **Построить несколько стоянок между костелом и Клецкова,29. Возможно строительство стоянок общим количеством мест около 500. (На схеме - 2)**
- **Построить несколько автостоянок в добавок к существующей между пр. Клецкова и 4-й клинической горбольницей. Возможно строительство стоянок общим количеством мест до 2000. (На схеме - 3)**
- **Ликвидировать стоянку УКСа и выделить места владельцам автомашин на новых автостоянках. На месте стоянки УКС запланировать строительство культурно-оздоровительного и торгового комплекса с подземным многоуровневым паркингом. (На схеме - 4)**
- **Включить в проекты застройки микрорайонов обязательное создание автостоянок, паркингов, мест для временной парковки.**

*Выгнать мелких торговцев и построить вместо мини-рынков супермаркеты – так гродненские власти видят «переход к цивилизованной торговле».*

# Нет места

**Более ста торговцев мини-рынка в микрорайоне «Форты» в Гродно уже в ближайшие недели останутся без работы. Администрация города предупредила их, что на этом месте расширит свои площади супермаркет “Немига Фаворит”.**

Фота: «Ведамасці»




**На рынке Форты скоро уберут все рабочие места**

Горисполком планирует закрыть еще три мини-рынка из семи действующих: на Фолюше, Девятовке и улице Полиграфистов. На месте мини-рынка на Девятовке пройдет часть объездной дороги. Кроме того, вместо мини-рынка возле универсама «Брест»планируется построить автостоянку. Новые рынки открываться не будут. ***“Сроки и планы по ликвидации мини-рынков есть, а другие рабочие места не предоставляют,-*** говорят предприниматели. ***- Куда нам деваться? У нас семьи, дети!”***

Найти другую работу в городе практически невозможно. Те, кому за 40, на рынке труда считаются “старыми”, а на мини-рынках работают в основном люди пред- и пенсионного возраста и многодетные матери, проживающие в ближайших микрорайонах. Правда, на собрании предпринимателей на рынке “Форты” заместитель председателя горисполкома ***Александр Сивцов*** пообещал трудоустроить всех: ***“На радиозаводе “Волна” цех откроется на 1400 человек, пойдете туда”.***

Главной причиной закрытия рынков исполкомовский чиновник называет «несоответствие мини-рынков санитарным нормам». В последнее время участились и без того многочисленные проверки санстанции. А как относятся сами жители микрорайонов к известию о закрытии мини-рынков?

Подавляющее большинство опрошенных корреспондентом «Ведамасці» ответили: “Отрицательно! Польза от рынка несомненна, он расположен недалеко от дома, здесь все намного дешевле, чем в магазине”

Жители Фортов - даже собрали около 2 тысяч подписей покупателей под обращением в горисполком в защиту своего мини-рынка. Но, как говорят организаторы акции: ***“На эти подписи даже никто не посмотрел, то есть, мнение общественности абсолютно не интересует власть”.***

В администрации города считают эту тему закрытой и упорно твердят, что качество продуктов и цивилизованные методы торговли обеспечивают только супермаркеты.

Заместитель председателя областного комитета профсоюза “Садружнасць” ***Оксана Горошко*** утверждает, что пострадавших от неудовлетворительного качества рыночной торговли - единицы, а закрытие рынков приведет к огромным издержкам: ***“Если ликвидируется рынок, то для предпринимателей должны быть созданы точно такие же условия и рабочие места, которые были”.***

Сами предприниматели с мини-рынка Форты считают его закрытие наступлением на малый бизнес ***“Хозяину супермаркета “Немига Фаворит”, который хочет нас убрать, мы как бельмо на глазу,-*** говорит бывшая учительница, а ныне предприниматель с 10-летним стажем. ***- У него в магазине все намного дороже, и люди идут к нам. Мы – конкуренты для них”.***

Судя по решительным действиям властей, мелкорозничная частная торговля и в самом деле кому-то очень мешает. Почему же власть, принимая решение о закрытии малых рынков, фактически поддерживает монополию крупного торгового капитала? Ситуацию комментирует председатель Совета республиканского общественного объединения предпринимателей “Перспектива” ***Анатолий Шумченко.*** Он считает, что во главу угла должно быть поставлено создание равных условий для реализации предпринимателями своих возможностей в крупном торговом центре или на рынке в палатке: ***“В том, что закрывают мини-рынки, просматривается интерес крупного торгового бизнеса и лоббирование его через структуры правительства. Прослеживается также явный интерес местных властей. Кто-то лоббирует интересы, кто-то эти интересы превращает в постановления, крайними становятся предприниматели».***

**Николай Новиков**

### Справка

В Гродно в настоящий момент работают 7 мини-рынков с общим количеством около 1000 торговых мест. 4 мини-рынка принадлежат «Гродноторгсервис» (“Фолюш”, “Форты”, “Девятовка”, “Принеманский”), один – Обувной фабрике (ул. Поповича), еще два – Областному потребсоюзу (ул. Полиграфистов, «Грандичский»). Мини-рынки предоставляют жителям спальных микрорайонов удобный доступ к товарам первой необходимости.

***«Международный опыт показывает, что при строительстве супермаркетов рынки начинают вымирать»***, - объясняет зампред горисполкома Александр Сивцов. Однако, пока Гродно остается единственным областным центром Беларуси, в котором нет супермаркета. Первый и последний гродненский супермаркет - «Максимус», он же «Алми» - уже смело можно считать памятником самому себе. Его гигантская недостроенная коробка за четыре года сменила третьего хозяина, хотя горисполком обещал его открытие уже в этом декабре. Так и не началось строительство супермаркета по ул Лиможа, обещанное в начале нынешнего года

Мини-рынки в сегодняшней форме создавались в Гродно в 2001-2003 годах именно как мера «перехода к цивилизованной торговле». Городские власти таким образом «упорядочивали» стихийную торговлю возле самых популярных магазинов. Торговля «с асфальта», однако, не исчезла и вряд ли исчезнет и после появления супермаркетов. Пожилым людям, которые продают в небольших количествах домашний творог, молоко, зелень с частных огородов, сало и мясо, яблоки, семечки, вяленую рыбу, носки ручной вязки - оплата места на мини-рынке, а тем более регистрация предпринимателем, остается не по карману.

# Спіртное абмежавалі

**Толькі да 21.00 на Гарадзеншчыне будуць прадаваць спіртное у крамах, ды кафэ аўтазаправачных станцыяў.**

Распараджэнне Гродзенскага аблвыканкама “Аб парадку рэалізацыі алкагольных напояў”, уступае ў сілу ад 15 лістапада. Згодна гэтай навацыі, спіртныя напоі ў вобласці можна прадаваць толькі ад 8.00 да 21.00. Раней было – да 22.00. Ініцыявала змены абласная міліцыя.

У справе абмежавання продажу спіртных напояў Гродзеншчына з’яўляецца перадавой у Беларусі. Першы раз гэта адбылося ў пачатку года - час продажу спіртнога абмежавалі 22 – й гадзінай. А пры гэтым Міністэрства ўнутраных спраў яшчэ толькі ўзгадняе з іншымі органамі ўлады абмежаванне продажу спіртнога ад 22.00 да 9.00 па ўсёй рэспубліцы.

Міліцэйскія чыноўнікі тлумачаць, што гэтая мера павінна паспрыяць пераадоленню п’янства і алкагалізму, а таксама паніжэнню ўзроўню злачыннасці.

Па інфармацыі Гродзенскага УУС у хуткім часе зменіцца і парадак рэалізацыі піва. Свае прапановы на гэты конт у аблвыканкам дасылают раённыя адміністрацыі.

**“Ведамасці”**

# Падаражэла

**Таксі**

С 1 декабря на 10% в Гродно дорожают поездки на такси в пределах города.

Причины подорожания проезда, который сейчас стоит 5000 рублей за поездку до 5 км и 1000 рублей за каждый лишний километр, пока не известны. Подорожание топлива по закону не дает основания поднимать тарифы, а тарифы по инициативе таксофирм могут увеличиться всего на полпроцента ежемесячно.

Между тем, с 1 ноября на 50% подорожали поездки на такси за город. Теперь каждый километр за пределами городской черты стоит 1,5 тыс руб, а не 1000, как раньше.

По информации частных таксистов, одна из причин роста цен - переход фирм на новые радиостанции, отечественного производства. Цена одной такой радиостанции составляет около 500 у.е..

С нынешней недели подорожали поездки такси в Минске, на 20%.

**Прадукты**

«Ведамасці» прасачылі, як ад пачатку года выраслі кошты на харчовыя прадукты ў гарадзенскіх крамах:

| Прадукты | Студзень 2007, руб | Лістапад 2007, руб |
|---|---|---|
| Мука пшанічная в/г. 1 кг. | 1 210 | 1 440 |
| Ялавічына, 1 кг | 9 700 | 14 300 |
| Свініна, 1 кг | 11 000 | 15 400 |
| Курыца бройлер, 1 кг | 5 600 | 8 900 |
| Малако 3,2%, 1 л | 840 | 890 |
| Рыба марожаная, хек, 1 кг | 6 700 | 7 900 |
| Алея сланечнікавая, 1 л | 2 800 | 5 200 |
| Масла вяршковае, 250 гр. | 1 680 | 2 010 |
| Яйка, 1 дз. | 2 060 | 3 140 |
| Гарэлка гарадзенская, 0,5 л | 5 360 | 6 180 |
| Віно пладова-ягаднае, 0,5 л | 2 130 | 3 510 |

# Уважліва!

**Студэнты, якія адсутнічалі без паважнай прычыны 3 навучальныя дні – будуць выключацца з вучобы.**

Рэктар Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы Яўген Роўба выдаў загад, згодна якому непрысутнасць студэнта на занятках без паважнай прычыны на працягу 3 дзён лічыцца “грубым парушэннем дысцыпліны”, за гэта навучэнец можа быць выключаны з універсітэта.

Загад выдадзены дзеля выканання спецыяльнага распараджэння Міндукацыі “Аб удасканаленні выхаваўчай ды ідэалагічнай работы і ўзмацнення кантролю за навучальнай дысцыплінай студэнтаў”.

Кантроль за выкананнем загаду ўскладзены на першага прарэктара Аляксандра Нечухрына.

Ці не выпадкова, але загад пачаў дзейнічаць якраз перад Еўрапейскім і Сацыяльным маршам дэмакратычных сілаў.

**“Ведамасці”**

# Свабода – гэта калі маеш выбар

**Рух “За Свабоду” праз інтэрнет звярнуўся да беларусаў з пытаннем, што для іх азначае Свабода. Мы атрымалі больш за 200 вызначэнняў. Дазволю сабе працытаваць чытачам “Ведамасцей“ некаторыя вельмі слушныя думкі, дзе беларусы выразна паказваюць сувязь паміж свабодай і адказнасцю:**


Фота: «Ведамасці»

Аляксандр Мілінкевіч

**Свабода** - гэта калі кожны думае і вырашае за сябе, а не ”адзін” за ўсіх.

**Свобода** – гэта адказнасць за ўчынкі.

**Свабода** – гэта галоўная каштоўнасць чалавека. Бо толькі свабодны чалавек сапраўдны гаспадар свайго жыцця.

**Свабода** - гэта калі маеш выбар, і ні хто не мае права цябе прымушаць!

**Свобода** - гэта калі лёс краіны вырашаеш ты сам, а не хтосьці за цябе.

**Свабода** – гэта твая годнасьць, твой гонар, твая адказнасьць, твой выбар быць ЧАЛАВЕКАМ

**Свабода** - гэта адказнасьць перад Богам і грамадствам за свае словы і дзеяннi.

**Свабода** - гэта гонар і годнасьць маёй краіны!

З усіх цэнтральнаеўрапейскіх народаў Беларусь найбольш пацярпела ад саветызацыі. Камунізм меў поспех ў нашай краіне не толькі ў будаўніцтве таталітарнага грамадства, але таксама ва ўкараненні ў людзях пачуцця пасіўнасці ды абыякавасці: у краіне за ўсё адказвае партыя і яе кіраўніцтва. У выніку, чалавек перастаў быць свабоднай асобай, ён нібы не нёс больш адказнасць за сваё ўласнае жыццё, сваю сям'ю, навакольле і краіну. Ён стаўся вінцікам, несвабоднай фігуркай. За ўсё, што ён мае, ён перадусім мусіў быць абавязаны менавіта партыі і яе “найвышэйшым прадстаўнікам”. Тыя ў сваю чаргу клапаціліся “як толькі могуць” пра ўсё і ўсіх, а калі ў іх нешта не атрымлівалася, гэта віна толькі і выключна ўнутраных ці знешніх ворагаў і нядобразычліўцаў. Найвышэйшае кіраўніцтва адрознівалася тым, што яно беззаганнае і беспамылковае, знаходзіцца па-за крытыкай і, адпаведна, не можа быць знятым са сваёй пасады. Кіраўніцтва не дае нікому справаздачы, і таму не нясе аніякай адказнасці за свае дзеянні перад грамадствам.

Гэтае становішча і дагэтуль захоўваецца ў Беларусі, дзе значная частка людзей ўсё яшчэ лічыць, што за іхняе жыццё і жыццё ўсёй краіне адказнасць нясе “вышэйшы кіраўнік”. Тое ж самае думае і Аляксандр Лукашэнка. Ён, гэтак жа сама як і былая савецкая партнаменклатура, не адрозніває паняцці адказнасць і ўлада. На практыцы сваё разуменне адказнасці за жыццё кожнага асобнага беларуса ён прымяняе ў выглядзе рашэнняў як пра даты правядзення пасяўной збожжа і бульбы, так і аб тым, якімі будуць вынікі выбараў, а таксама каму быць на свабодзе, а каму месца за кратамі.

Але гэта яшчэ не азначае, што сённяшняя сітуацыя ў Беларусі нязменная і што нам наканавана жыць толькі так, а не інакш. Па прыкладу таго, як больш чым 15 год таму абрынуўся “нерушимый” Савецкі Саюз, зменіцца і рэжым ў нашай краіне. Уласна, цяпер усё больш павялічваецца колькасць тых, хто не жыў пры савецкай уладзе і хто не згодны з негатыўным стаўленнем рэжыму Аляксандра Лукашэнкі да еўрапейскіх каштоўнасцяў. Менавіта маладыя, больш адукаваныя людзі хочуць жыць у нармальнай еўрапейскай дэмакратычнай краіне, пабудаванай на прынцыпах павагі да асобы і індывідуальнай адказнасці кожнага грамадзяніна за сваё жыццё і сваю краіну.

Свабоды трэба дамагчыся, яе трэба заслужыць. Так рабілі іншыя народы Еўропы. І мы ідзем тым жа шляхам.

**Аляксандр Мілінкевіч**

## Далучаемся да святкавання Калядаў!!!

Калядаванне па хатах, сапраўднае свята для дарослых і забаўляльная праграма для дзетак. Гэта ўсё рэальна! Ёсць група ахвотных, якая ўзялася за падрыхтоўку свята. Калі вам цікавыя беларускія калядныя звычаі, калі вы хочаце жыць актыўна, а не марнаваць час перад тэлевізарам – далучайцеся!

Беларускія каляды не павінны прайсці без Вас!

**Усім зацікаўленым звяртацца да Ігара Кузьмініча па тэлефонах: 8 (029) 629 92 13 альбо 8 (029) 868 98 82.**

РУХай з намі!

# Закладзена Алея памяці паўстанцаў

Старшыня Вярхоўнага Савета 12-га склікання Станіслаў Шушкевіч распачаў новую традыцыю ў святкаванні Дня памяці паўстанцаў, які штогод адзначаецца ў Свіслачы, што на Гарадзеншчыне. На запрашэнне Гарадзенскага Руху “За Свабоду” Станіслаў Шушкевіч пасадзіў першы дубок у Алею памяці паўстанцаў.

Нагадаем, што 27 кастрычніка дэмакратычная грамадскасць Гродна, Свіслачы ды іншых гарадоў Беларусі адзначыла традыцыйны Дзень памяці паўстанцаў 1863 года.


Фота: «Ведамасці»

**Станіслаў Шушкевіч укопвае першы дубок Алеі памяці паўстанцаў. Дрэўца трымае адзін з заснавальнікаў Руху “За Свабоду”, кіраўнік абласной арганізацыі БСДГ Віктар Сазонаў.**

# “Caracas, no repitas los errores de Hrodna!”

**“Caracas, no repitas los errores de Hrodna!” - “Каракас не паўтары памылак Гродна!” З такім заклікам кіраўніцтва гродзенскай філіі руху «За свабоду» звярнулася да прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса. “Рухаўцы” заклікаюць прэзідэнта быць асцярожным, прымаючы прапановы беларускага Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва па рэстаўрацыі гістарычнага цэнтра сталіцы Венесуэлы Каракасу.**

Нагадаем, дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА паведаміла пра дамоўленасць паміж Венесуэлай і Беларуссю пра ўдзел беларускіх рэстаўратараў у аднаўленні гістарычнага цэнтра Каракасу. У час візіту ў Венесуэлу беларускай дэлегацыі з Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва была дасягнута дамоўленасць аб прадстаўленні ў снежні праекта рэстаўрацыі гістарычнай часткі Каракасу.


...“El movimiento de Hrodna “Por la libertad” (Гарадзенскі Рух “За Свабоду”) esta preocupado por el destino de la zona histórica de Caracas, el diamante de la América Latina. Estamo[s] [pr]eocupados porque nosotr[os]

***«Гродзенскі рух «За Свабоду» занепакоены лёсам гістарычнай часткі Каракасу, гэтай жамчужыны Лацінскай Амерыкі. Занепакоены таму, што мы, гродзенцы, у сваім родным горадзе пабачылі вынікі гэтак званай рэканструкцыі. За апошнія гады «спецыялісты» метадычна і цынічна зруйнавалі гістарычны цэнтр старажытнай Гародні, якая са стратамі перажыла некалькі стагоддзяў расійскай акупацыі, амаль 50 год Савецкага Саюзу, Першую і Другую сусветныя войны»,*** — гаворыцца ў заяве.

Рух «За Свабоду» нагадвае Уга Чавесу, што нягледзячы на ахвярную кампанію па ратаванні Гродна ўладам усё ж удалося зруйнаваць частку гістарычнай забудовы горада. Гродзенцы маюць намер накіраваць у мэрыю Каракасу збор фота гістарычнага цэнтра Гродна перад і пасля гэтак званай рэканструкцыі.

***“Каракас, не паўтары памылак Гродна!»,*** — заклікае гродзенскі рух «За Свабоду».

***- Мы занепакоены лёсам сталіцы Венесуэлы. Мала таго, што ў 50-х гадах XX-га стагоддзя дыктатар Перас Хіменэс амаль знішчыў каланіяльную архітэктуру Каракаса, дык зараз справу могуць скончыць беларускія «адмыслоўцы». Мы разлічваем на сумленне прэзідэнта Уга Чавеса, на тое, што сапраўдны патрыёт сваёй краіны не дапусціць знішчэння гістарычных каштоўнасцей. Гэтак беларускія спяцы дабяруцца і да возера Ціцікака ў суседнім Перу!,*** - каментуюць ліст Уго Чавесу актывісты Руху За Свабоду.

Акрамя таго, гарадзенскіх рухаўцаў непакоіць наступствы ад рэканструкцыі Каракасу для беларускага турызму: ***«Паміж Беларуссю і Венесуэлай усталяваны безвізавы рэжым. Але мноства простых беларусаў могуць так і не пабачыць каракаскія цікавосткі! Трэба не дапусціць магчымага руйнавання Каракасу!».***

# Новыя прэзентацыі ў Гродна

**У Гродна працягваецца распачатая Рухам “За Свабоду” “Гарадзенская восень прэзентацый”.**

На 20 снежня запланавана прэзентацыя створанай з удзелам 30 палітычных, грамадскіх і культурных дзеячоў Беларусі (Аляксандр Мілінкевіч, Вольга Абрамава, Вячаслаў Кебіч, Сяргей Касцян, Валеры Фралоў, Усевалад Янчэўскі ды іншыя) кнігі ***«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт».*** Праца адлюстроўвае погляды беларускай эліты на пытанне месца Еўропы і Расіі ў нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Удзел у прэзентацыі маюць намер узяць рэдактар Валерка Булгакаў, эксперты-палітолагі Віталь Сіліцкі, Дзяніс Мельянцоў.

**21 лістапада і 4 снежня** пройдуць таксама прэзентацыі кнігі гарадзенскага даследчыка і публіцыста **Уладзіміра Хільмановіча “Беларускі каляндар-даведнік на кожны дзень”**, знаўцы гісторыі Беларусі XIX-XX стст. **Сяргея Токця, “Беларуская вёска ў эпоху зменаў”.**

Пачатак як заўсёды **18.30 па адрасе: вул. Будзёнага 48а-44** (памяшканне Таварыства Беларускай Школы). Уваход вольны.

Дадатковая інфармацыя па ***zasvabodu.hrodna@gmail.com***


Фота: «Ведамасці»

**17 кастрычніка ў Гродна прэзентаваў “Імёны Свабоды” знакаміты Уладзімір Арлоў**

Выдаецца па ініцыятыве Гарадзенскага Руху «За Свабоду» Адрас рэдакцыі: г. Гродна, пл Тызенгаўза,1. Галоўны рэдактар Антоні Тызенгаўз Падпісана ў друк 18.11.2007.
Наклад адпаведна заканадаўству. Надрукавана на ўласным абсталяванні рэдактара. Замовіць падпіску на электронную ці папяровую версію газеты «Ведамасці» можна па адрасе: zasvabodu.hrodna@gmail.com